# ТРЫ НОРМЫ ЗА ЗМЕНУ

ДАЛЕКА за межамі Салігорска вядомы поспехі камсамольска-маладзёжнай брыгады Васіля Нікіценкі. Узводзячы абагачальную фабрыку, — важнейшы аб'ект першынца горнай хіміі Беларусі — будаўнікі гэтага калектыву ўклалі за апошнія 19 дзён верасня 320 кубаметраў цэглы.

Тут стала традыцыяй: кожны член брыгады павінен выканаць не менш двух кубаметраў кладкі. Каштоўную прапанову ініцыятараў спаборніцтва падхапілі ўсе будаўнікі. Цяпер кожны, хто працуе на гэтым аб'екце, стараецца перавыканаць зменнае заданне.

У рабочым калектыве разгарнулася спаборніцтва за званне лепшага па прафесіі будаўніка. Яго ўжо ўдастоены муляры Анатоль Траян і Адам Валодзька. Тры — тры з палавінай кубаметры кладкі — такі вынік іх штодзённай работы. А ў асобныя дні яны ўкладвалі нават па чатыры з палавінай кубаметры цэглы. Гэта тры зменныя заданні.

Працоўны ўздым не гасне і цяпер. Будаўнікі далі слова месячнае заданне выканаць датэрмінова.

В. РЭПНІК,
муляр.